батлеечников. Коллективы-участники по завершении конкурсной программы традиционно демонстрируют благотворительные спектакли в больницах сестринского ухода, приемных семьях, социальном приюте.

По благословению Митрополита Минского и Заславского, Патриаршего Экзарха всея Беларуси Павла в Минске ежегодно проходит Международный Рождественский фестиваль батлеечных и кукольных театров «Нябёсы». Идея фестиваля принадлежит сестре милосердия Свято-Елисаветинского монастыря Людмиле Жданович. Характерной особенностью фестиваля «Нябёсы» является проведение его в стенах монастыря, что непосредственно сказывается на организации и атмосфере фестиваля. В перерывах между конкурсными спектаклями проходят познавательно-развлекательные программы для детей и интерактивные программы для зрителей с актерами театра. Среди них весомую долю занимают музыкальные номера, представленные в различных жанрах, стилях и разнообразных исполнительских составах. Все желающие имеют возможность посетить мастер-классы по соломоплетению, изготовлению кукол, рисованию.

Программа фестиваля «Нябёсы» обширна, в нее включены: конкурсный показ; пресс-конференции и «круглые столы» по вопросам развития батлеечного искусства; творческие встречи с руководителями театральных коллективов; мастер-классы для преподавателей воскресных школ, педагогов и творческой молодежи с мастерами батлеечного и кукольного искусства; художественные тематические выставки; благотворительная акция «Свет души – добродетель» и конкурс рисунка среди воспитанников воскресных школ.

На современном этапе для обоих фестивалей «Чароўны свет батлейкі» и «Нябёсы» характерны неуклонный рост и развитие. Данная тенденция ярко прослеживается на примере фестиваля «Нябёсы», за короткий срок фестивалю удалось выйти на международный уровень, стать известным за пределами Республики Беларусь. Налаживание и укрепление международных культурных связей Республики Беларусь с зарубежными странами отражается в таких проектах, как показ российско-белорусского спектакля с участием театра «ТриЛика» (г. Москва, Россия) и частного театра «Провинция» (г. Гродно, Беларусь); российско-литовского спектакля при участии театра «ТриЛика» (г. Москва, Россия) и театра «Stalo Teatras» (г. Вильнюс, Литва).

Таким образом, фестивали батлеечных театров имеют важное значение в пространстве художественной культуры Беларуси. В рамках фестивального движения специализированные батлеечные фестивали выполняют множество задач, таких, как развитие театрального батлеечного искусства; изучение творческого опыта лучших батлеечных театров; поддержка, стимулирование и развитие народного батлеечного творчества; укрепление связей на партнерской основе между театрами. Благодаря тенденции возрождения в Беларуси любительского театрального творчества, батлейка органично вписывается в контекст современного театрального искусства и фестивального движения Беларуси.

**Список литературы:**

1. Официальный интернет-портал Свято-Елисаветинского монастыря [Электронный ресурс] / Международный Рождественский фестиваль батлеечных и кукольных театров «Нябёсы». – Режим доступа : https://www.obitel-minsk.by/nyabesy. – Дата доступа : 20.03.2018.

***Вольга Лук'янец, Таццяна Блешчава, Наталля Хмяльніцкая***

## РАДЗІННАЯ АБРАДНАСЦЬ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

*Матэрыял пра даследаванне абрадавых радзінных традыцый, працэсы іх трансфармацыі ў сучасным побыце, уплыў хрысціянства на фарміраванне культурных каштоўнасцей і традыцый беларусаў.*

***Wolpa Luk'yanets, Tatziana Bleschava, Natalya Khmyalnitskaya***

## FAMILY RITUALS OF BELARUSIAN PEOPLE

*The text gives information about the traditions of childbirth and contents a detailed analysis of their changes in the modern everyday life; it is concerned with the influence of Christianity on Belarusian cultural values and traditions.*

Сямейная абраднасць ахоплівае найбольш важныя этапы ў жыцці чалавека – нараджэнне, вяселле, пахаванне, памінкі – якраз усе тыя моманты, якія былі найбольш значнымі, пэўнай мяжой на жыццёвым шляху чалавека. І хоць усе яны абгрунтаваныя практычнай неабходнасцю, іх змест у асноўным напоўнены клопатам аб працягу роду чалавечага, здаровым развіцці будучага пакалення. Бо нездарма ж у народзе кажуць: *«Калідзіця на свет прыходзіць, новы кавалак хлеба родзіць», «Без дзяцей ціха, ды на старасці ліха».*

Традыцыйныя радзінныя звычаі і абрады беларусаў у канцы XIX–пачатку XX стст. уяўлялі сабой стройную сістэму, у якой знайшлі адлюстраванне розныя бакі народнай культуры, хрысціянскіх традыцый, светапогляду. Адначасова яны самі з'яўляліся састаўной часткай духоўнай культуры і народнага побыту. Таму вывучэнне традыцыйных радзінных звычаяў і абрадаў беларускага народа дае магчымасць даведацца пра галоўныя каштоўнасці беларуса, сярод якіх былі *сям'я, праца, дом, Радзіма*. Беларус імкнуўся жыць у згодзе са сваім сумленнем, з людзьмі, якія знаходзяцца побач, з навакольным светам. Выконваючы прынятыя ў пэўнай мясцовасці абрады і рытуалы, чалавек верыў, што гэтым забяспечвае сабе і сваім блізкім шчасце, здароўе, багацце, добры ўраджай. Веданне і выкананне традыцыйных абрадаў і нормаў паводзін стваралі чалавеку або сям'і добрую славу, якая перадавалася з пакалення ў пакаленне і высока ацэньвалася абшчынай.

Усё вышэй сказанае паказвае на **актуальнасць** тэмы даследавання.У працы даследуюцца працэсы трансфармацыі традыцыйных звычаяў і абрадаў радзіннага комплексу сямейнай абраднасці ў сучасным побыце насельніцтва Беларусі, разглядаецца ўплыў хрысціянства на фарміраванне культурных каштоўнасцей і традыцый беларусаў.

Шмат інфармацыі было выкарыстана з матэрыялаў даследчыкаў XIX стагоддзя Паўла Шэйна, Еўдакіма Раманава, Аляксандра Сержпутоўскага, а таксама сучасных даследчыкаў Таццяны Кухаронак, Уладзіміра Сысова. Вялікую цікавасць уяўляе том «Радзінная паэзія» з серыі шматтомнага выдання беларускай народнай творчасці, падрыхтаваны Маісеем Грынблатам (Мн., 1971 г.).У ім сабраныя радзінныя песні, застольныя жарты, прымаўкі, адпаведныя прыказкі з розных рэгіёнаў Беларусі [13, с. 26].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Мэтай** працы з’яўляецца правядзенне аналізу радзіннай абраднасці ў традыцыйнай культуры беларусаў і ўплыў хрысціянства на фарміраванне духоўнай культуры насельніцтва розных рэгіёнаў.**Задачы**, пастаўленыя пры вывучэнні абраду, наступныя: апісаць беларускі традыцыйны радзінны абрад;даследаваць яго ролю ў традыцыйнай культуры беларусаў;выявіць асаблівасці радзіннага абраду ў залежнасці ад тэрытарыяльнага падзелу Беларусі і рэлігійнага веравызнання;стварыць інфармацыйны рэсурс «Бабуліны песні» як сродак захавання нацыянальнай культурнай спадчыны нашага народа.

Радзінную абраднасць большасць даследчыкаў дзеліць ўмоўна на 3 часткі (цыклы): **народавы** (звычаі і абрады, звязаныя з цяжарнасцю жанчыны);**роды;пасляродавы цыкл** (наданне імя дзіцяці, адведванне парадзіхі і нованароджанага, выбар кумы, хрэсьбіны, «ачышчэнне», зразуменне дзіцяці).

Праца ахоплівае адрэзак часу канец XIX-XXI стагоддзі.Менавіта ў гэты перыяд найбольш актыўным было вывучэнне традыцыйнай культуры беларускага народа. **Неабходна, каб мы больш цікавіліся нашай культурай, працягвалі лепшыя традыцыі цягам многіх пакаленняў.** І такім чынам, каб мы мелі магчымасць, спалучыўшы набыткі мінуўшчыны, перанесці іх на дзень сённяшні і прэзентаваць на будучае.

*Дзіця* ў традыцыйнай культуры беларусаў разглядалася як неад’емная частка прыроды; яго зачацце, нараджэнне, развіццё і выхаванне падпарадкоўваліся агульным касмічным законам. Веданне продкамі гэтых законаў абумовіла і з’яўленне шматлікіх перасцярог і правілаў паводзін для жанчын у перыяд цяжарнасці. Большасць непісаных законаў непасрэдна вынікае са шматвяковага вопыту і практычнага сэнсу.*Ва ўсіх рэгіёнах Беларусі* строга сачылі, каб цяжарныя не працавалі ў царкоўныя святы, не рабілі што-небудзь ўпотай ад мужа ці іншых членаў сям’і, не выкідвалі хлеб. Старанна прытрымліваючыся ўсіх мясцовых звычаяў, жанчына атрымлівала ўпэўненасць у паспяховым праходжанні родаў, псіхалагічна была да іх гатовая.

*Нараджэнне дзіцяці* – адін з цудаў прыроды. Людзям ва ўсе часы хацелася, каб будучы чалавек нарадзіўся моцным, прыгожым, здаровым, разумным, сумленным духам, добрым, таму яшчэ ў старажытнасці звярталіся да найпрацейшых прыёмаў магіі, імкнучыся такім чынам запраграмаваць ў дзіцяці гэтыя якасці.

*Пасляродавы цыкл* традыцыйнага радзіннага комплексу ў асноўным сімвалізаваў прыняцце нованароджанага ў сям’ю і грамадства ў цэлым. Ён уключаў абрады праведвання парадзіхі і нованароджанага, выбару кумоў, а таксама святкавання хрэсьбін, ачышчэння, першага пастрыжэння дзіцяці [6, с. 3].

Прааналізаваны матэрыял дазваляе зрабіць наступныя **высновы**.Традыцыі кожнага народа складваюцца стагоддзямі, тысячагоддзямі і перадаюцца з пакалення ў пакаленне як неад’емная частка жыццёвага ўкладу чалавека. Ва ўсе часы тое, што тычыцца паняцця «традыцыйны», захоўвалася ў народзе як самая дарагая спадчына, паколькі любая традыцыя ў першую чаргу адказвае духоўным патрэбам чалавека. Менавіта таму па сённяшні дзень захоўваюцца нацыянальныя, хрысціянскія традыцыі кожнага этнасу, яго абрады і звычаі [7, с. 73].

Менавіта патрэба ў тлумачэнні абрадавай тэрміналогіі на ўроках гісторыі і беларускай літаратуры абумовіла (**у выніку даследчай працы**) стварэнне слоўніка «Радзінная абраднасць беларускага народа». Быў абраны шэраг паняццяў, тэрмінаў і крылатых выразаў, якія могуць сустракацца ў гістарычных матэрыялах, творах і выклікаць цяжкасці ў вучняў пры іх перакладзе і тлумачэнні.

А думка стварыць электронны інфармацыйны рэсурс для сучаснай моладзі «Бабуліны песні. Прыказкі. Прымаўкі» прыйшла ў працэсе работы над вывучэннем матэрыялаў этнаграфічных экспедыцый, энцыклапедый і даведнікаў. Гэта аказалася першым матэрыялам і вельмі ўдалым, як паказала практыка. У далейшым плануецца стварыць сумесны праект з творчым калектывам «Дударыкі», які працуе на базе гімназіі № 14, па захаванні сямейных традыцый праз гучанне радзінных песен і знаёмства з імі слухачоў, праз сумеснае вывучэнне радзіннага фальклору [3, с. 4].

Такім чынам, звычаі і абрады, якія суправаджалі нараджэнне дзіцяці ў беларусаў у канцы XIX–пачатку XXI стст., прадстаўлялі **цэласную сістэму**, **для якой характэрна адзінства светаўспрымання і абрадавага дзеяння.** Дзякуючы сваёй цэласнасці, гэтая сістэма захавала найбольш каштоўнае з усяго, што стыхійна стварылі народная медыцына, філасофія, этыка, мастацтва.

І хоць сямейныя абрады вельмі старажытныя па сваім паходжанні, да сённяшніх дзён яны не страцілі мэтанакіраванасці і прызначэння ў народным жыцці, змаглі захаваць адну з самых цікавых старонак народнага побыту, нашай нацыянальнай культурнай спадчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс літаратуры:**


1. Беларускія народныя абрады. – Мінск : Беларусь, 1994. – 260 с.
2. Беларусы. Сям'я. – Мінск : Навука і тэхніка, 2001. – Т. 5. – 320 с.
3. Белорусы (сб. ст.) / РАН Институт антропологии им. Н. Миклухо-Маклая. – М. : Наука, 1998. – 320 с.
4. Багдановіч, А. Перажыткі старажытнага светаўспрымання ў беларусаў / А. Багдановіч / рэпр. выд. – Гродна : ГрДУ, 1995. – 220 с.
5. Жыцця адвечны лад : Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад. У. Васілевіч. – Мінск : Беларусь, 1998. – 360 с.
6. Зеленин, Д. Восточнославянская этнография / Д. Зеленин. – М. : Наука, 1991. – 320 с.
7. Карский, Е. Беларусы / Е. Карский. – М. : Мысль, 1904. – 420 с.
8. Кухаронак, Т. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў. – Мінск : Навука і тэхніка,1993. – 290 с.
9. Міцкевіч, А. Сямейная абраднасць беларускага народа / А. Міцкевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1966. – 320 с.
10. Нидерле, Л. Славянские древности. – М. Наука, 1956. – 420 с.
11. Никифоровский, Н. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные предания про личности и места / Н. Никифоровский. – Вицебск : Дума, 1897. – 320 с.
12. Грамадскі сямейны побыт і духоўная культура насельніцтва Палесся. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 280 с.
13. Радзіннная паэзія / уклад. М. Грынблат. – Мінск : Навука і тэхніка, 1971. – 320 с.
14. Радзіны. Абрады. Песні / уклад. М. Грынблат. – Мінск : Навука і тэхніка, 1998. – 320 с.
15. Ракава, Л. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы. –Мінск : Ураджай, 2000. – 220 с.
16. Романов, Е. Белорусский сборник / Е. Романов. – Вильня, 1912. Выпуск 8. – 240 с.
17. Русский семейный общественный быт. – М.: Просвещение, 1986. – 240 с.
18. Сержпутоўскі, А. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. Сержпутоўскі. – Мінск : Беларусь, 1998. – 320 с.
19. Сямейны-абрадавая паэзія. Народны тэатр / укл. А. Фядосік, А. Емяльянаў, У. Сысоў [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 2001. – 360 с.

20. Сям'я і сямейны побыт беларусаў. – Міснк : Ураджай, 1990. – 240 с.
21. Сысоў, У. З крыніцспрадвечных / У. Сысоў. – Мінск : Вышэйшая школа, 1997. – 416 с.
22. Шэйн, П. Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю / П. Шэйн.– СПб., 1902. – Т. 3. – 360 с.
23. Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя / рэд. І. Шамякін. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 575 с.

*Іна Алексніна*

## МУЖЧЫНСКІЯ АНТРАПАМОРФНЫЯ КАЛЯДНЫЯ ПЕРААПРАНАННІ ЖЫХАРОЎ ЗАХОДНЯГА ПААЗЕР’Я

*У артыкуле апісваюцца найбольш характэрныя мужчынскія антрапаморфныя калядныя пераапрананні, што бытавалі ў першай палове XX стагоддзя на тэрыторыі Заходняга Паазер’я.*

*Іна Алексніна*

## MEN’S ANTRAPAMORPHIC CHERRY CHRISTMAS IMAGE SHIFT IN WEST LAKE DISTRICT

*This article describes the most typical male anthropomorphic Christmas dressing used in the 1st half of the 20th century in West Lake District.*

Самым «тэатральным» святам беларускага земляробчага календара на тэрыторыі нашай краіны былі Каляды. Святкаванне Каляд адбывалася з 24 снежня па 6 студзеня і было прымеркавана да дня «адраджэння» сонца, якое паварочвала на лета, несла цяпло і давала новыя спадзяванні на гадавы дабрабыт і дастатак у гаспадарцы. Менавіта калядныя святы здзіўляюць багаццем мастацкіх колераў, выяўляюць элементы маскараду ў традыцыйных абыходах вёсак калядоўшчыкамі, даюць волю выявіць свае мастацкія здольнасці і таленты кожнаму ўдзельніку своеасаблівага карнавала.

Калядныя пераапрананні былі вельмі распаўсюджаны практычна па ўсёй тэрыторыі сучаснай Беларусі пачынаючы з X ст. У Гусцінскім летапісе аўтар адзначае «сему бесу (коляде) в память простая чадь сходяться в навеченіе Рождества Хрістова и поют песни некіе, в нихъ же аще и о Рождестве Христовомъ поминають, но более коляду беса величают» [5, с. 77].

Маскіраванне і пераапрананні на Каляды сустракаюцца як па ўсёй Беларусі, так і на тэрыторыі даследуемага намі рэгіёна і ў XIX – пачатку XX стагоддзяў.

Калядных персанажаў даследчыца Т. І. Кухаронак падзяляе на тры асноўныя групы: зааморфныя – каза (казёл), мядзведзь, кабыла (конь), бусел (жораў, журавель), бык (тур, карова), воўк, ліса, заяц; антрапаморфныя – дзед (старац), баба (старчыха, баба Яга), цыган і цыганка, яўрэй і яўрэйка, афіцэр (салдат, гусар, генерал, казак,ураднік, улан, гайдук), якi часцей за ўсё выступаў у пары з маладзіцай (барыняй), пан (паніч) і паненка, цар або кароль, поп і дзяк, доктар (фельчар, венгр-аптэкар, лекар-аптэкар) пастух, грабаўшчык, ямшчык, сват, плакальшчыца; міфічныя істоты – анёл, шчодра (шчадрыца), чорт (д’ябал), смерць, каляда, ведзьма [2, с. 16].

З антрапаморфных мужчынскіх калядных пераапрананняў для рэгіёна найбольш характэрныя вобразы «дзеда» (якога многія інфарматары пад уплывам сучасных разуменняў называюць «дзед-мароз») і «цыганоў». Выдатны польскі даследчык К. Машыньскі ў манаграфіі «Kultura ludowa slowian» змяшчае апісанні і выявы масак калядоўшчыкаў з вёскі Цяцеркі Браслаўскага раёна, якія сведчаць аб дастаткова высокім майстэрстве народных умельцаў у вырабе масак адпаведнага тыпу. Маска «дзеда» зроблена з бяросты і льну, а «цыгана» – са скуры і воўны [4, с. 289-290].

Найбольшай папулярнасцю ў рэгіёне карысталіся таксама вобразы «цыган». Трэба адзначыць, што прадстаўленні з іх удзелам ладзілі не толькі дарослыя, але і дзіцячыя гурты. Напрыклад, у в. Вайнюнцы на Браслаўшчыне на другі дзень каталіцкага свята «Тшы крулі» («Тры каралі»), якое святкавалі 7 студзеня, дзеці (як хлопчыкі, так і дзяўчынкі), апранутыя ў дарослае адзенне, прадстаўлялі «цыган».

Выканаўцы імкнуліся не толькі да вонкавага падабенства, якога дасягалі з дапамогай пераапранання, выкарыстання натуральнага грыму (сажа, буракі) і рэквізіту (маністы, хусткі, бразготкі), але і сваімі паводзінамі, спевамі, танцамі, варажбой), імкнуліся найбольш характэрна паказаць пластыкай, мовай прадстаўляемыя вобразы [3].

Зусім рэдка, але сустракаюцца ў рэгіёне пераапрананні ў «ямшчыкоў», якія разам з «цыганамі» рыхтавалі «звязду», упрыгожвалі коней і ездзілі па вёсках калядаваць. Касцюм “ямшчыка” складаўся з шапкі, буркі, падперазанай вяроўкай, штаноў і пугі. Калядныя ямшчыкі выконвалі функцыі сапраўдных ямшчыкоў – вазілі калядоўшчыкаў на павозках.

Не характэрным для вывучаемай часткі Беларусі было і пераапрананне ў «яўрэяў». Магчыма, гэты факт абумоўлены тымі абставінамі, што на Дзісненшчыне да Вялікай Айчынай вайны асобы яўрэйскай нацыянальнасці складалі большую частку насельніцтва, а ў некаторых мястэчках (Браслаў, Докшыцы) да 1939 г. іх было амаль 80% ад агульнай колькасці жыхароў. Адсутнасць вобраза «яўрэя» у калядаванні на тэрыторыі даследуемага рэгіёна можна растлумачыць маральна-эстэтычнымі паняццямі, павагай да сваіх суседзяў.

Яшчэ адным тыпам каляднага пераапранання і вандравання, якое мела пэўныя адрозненні ад тэрыторый Цэнтральнай і Усходняй Беларусі, быў абрад хаджэння «Трох каралёў» на гэта каталіцкае свята. Яно атрымала назву ў гонар трох каралёў Каспара, Мельхіёра і Балтазара, якія, згодна біблейскаму паданню, прыйшлі на святло Віфлеемскай зоркі, каб пакланіцца нованароджанаму Ісусу Хрысту. Абрад характэрны для населеных пунктаў, дзе пераважную большасць насельніцтва складалі католікі, якія не калядавалі 25 снежня. Нельга не адзначыць падабенства ў прынцыпах калядавання і рэпертуары «звяздароў» і «Трох каралёў».

Найбольш цікавыя варыянты гэтага звычаю зафіксаваны на Пастаўшчыне і, часткова, на Браслаўшчыне, дзе акрамя «каралёў» у гурце ўдзельнічалі і іншыя персанажы: «анёл», «чорт», «пастушкі». Напрыклад, у в. Лынтупы збіралася 6-7 хлопцаў, якія бралі дазвол на хаджэнне па сваёй парафіі і рыхтаваліся да абыходу вёсак. На галаве кожнага «караля» была высокая бліскучая шапка, падобная на шалом. Вопратка – вышываная, упрыгожаная накшталт адзення ксяндзоў («комжы»). У руках яны трымалі доўгія апрацаваныя палкі, якія нагадвалі посахі. На вяршыні шаломаў і посахаў замацоўваліся выразаныя і размаляваныя фігуркі каралёў. Паводзіны «каралёў», «анёла» і «пастушкоў» былі прадыктаваны рэлігійнымі канонамі, хоць ад іх і патрабаваліся знешнія даныя, валоданне голасам і пластыкай. Жывінку ўносіў «чорт», для выканання ролі якога выбіралі найбольш жвавага, артыстычнага хлопца. Яго апраналі ў чорнае адзенне або вывернуты кажух, вымазвалі твар сажай, прычаплялі рогі, бараду, хвост, у які (з мэтай абароны ад дзяцей) тыкалі шпількі. Ён паводзіў сябе адпаведна вобразу: пужаў дзяцей, заігрываў з гаспадынямі, «спакушаў» іх [1].



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ